# АСОБАСНА-ПРАФЕСІЙНАЕ САМАВЫЗНАЧЭННЕ СТАРШАК-ЛАСНІКАЎ (КАШТОЎНАСНЫ АСПЕКТ)

М.С.Кавалевіч
г.Брэст, БрДУ

Прафесійнае станаўленне асобы пачынаецца з працэсаў самавызначэння і з'яўляецца самым працяглым перыядам жыцця чалавека, які развіваецца па індывідуальнаму сцэнарыю і мае сваю ўласную траекторыю прафесійнага жыцця.

Вялікую ролю ў асобасным і прафесійным самавызначэнні адыгрывае сістэма каштоўнасцяў. Вызначэнне чалавекам сябе ў грамадстве мае на ўвазе самавызначэнне адносна сацыякультурных каштоўнасцяў. Каштоўнасна-сэнсавы змест з'яўляецца важнейшым у асобасным самавызначэнні. Даказана, што паспяховае самавызначэнне характарызуецца каштоўнаснай насычанасцю, а непаспяховаму характэрна каштоўнасная пустата (3). Жыццё мае сэнс, калі прысвечана рэалізацыі каштоўнасных мэтаў. Пошук сэнсу жыцця – пошук каштоўнасцяў. Вобласць сэнсу, каштоўнасцяў і самарэалізацыі – тая вобласць, у якой адбываецца ўзаемадзеянне асобы і грамадства. "Канцэпцыя жыцця" вызначае іерархію каштоўнасцяў, арыентуе чалавека больш-менш універсальна (6,66 – 79).

Важнейшую ролю адыгрывае набыццё каштоўнасцяў у старэйшым падлеткавым і юнацкім узросце, калі «падлетак выходзіць на зносіны з грамадствам (шырэй – са светам чалавечай культуры «напрамую» (1;5) . Характар гэтых каштоўнасцяў і вызначае ўяўленні юнака пра сваю прафесійную будучыню. Яна можа ўспрымацца як спосаб дасягнення высокага грамадскага становішча, як патрэба ў развіцці сваіх фізічных і (або) інтэлектуальных здольнасцяў, праяўленні творчай ініцыятывы, як спосаб самаразвіцця і самарэалізацыі

Сучасных вучоных і творчых педагогаў-практыкаў хвалюе пытанне, як выхаваць чалавека не толькі разумным, але і высокамаральным, духоўна багатым, які ведае сэнс свайго жыцця, верыць у магчымасць яго здзяйснення, мэтанакіравана і актыўна працуе ў імя найбольш поўнай жыццёвай самарэалізацыі. У сувязі з гэтым уяўленні педагога аб сістэме каштоўнасцяў сучасных старшакласнікаў з'яўляюцца неабходнай умовай іх эфектыўнай педагагічнай падтрымкі у сітуацыі выбару прафесіі.

Для вызначэння каштоўнасных арыентацый сучасных старшакласнікаў інавацыйных тыпаў навучальных устаноў намі была выкарыстана методыка

М.Рокіча, заснаваная на непасрэдным ранжыраванні спісу каштоўнасцяў. Рэспандэнтам былі прапанаваны два класы каштоўнасцяў:

1. Тэрмінальныя – перакананні ў тым, што пэўная мэта індывідуальнага існавання заслугоўвае таго, каб да яе імкнуцца.
2. Інструментальныя – перакананні ў тым, што пэўны спосаб дзеяння або якасць асобы маюць перавагу ў любой сітуацыі.

Кожны блок уключаў па 18 каштоўнасцяў, якія было прапанавана праранжыраваць рэспандэнтам у парадку значымасці асабіста для кожнага з іх. Спачатку быў прад'яўлены блок тэрмінальных каштоўнасцяў, а затым блок інструментальных каштоўнасцяў, што адпавядае традыцыйнаму дзяленню на каштоўнасці-мэты і каштоўнасці-сродкі.

У працэсе даследавання нам удалося зафіксаваць іерархію каштоўнасцяў навучэнцаў сучасных інавацыйных навучальных установ (гімназія №2 і ліцэй №1 г.Брэста). Атрыманыя вынікі самаацэнкі і ранжыравання каштоўнасцяў пакажам у зводнай табліцы 1.1

| № п/п | Спіс тэрмінальных каштоўнасцяў | Агульны рангавы бал | Сярэдні рангавы бал | Рангавае месца |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Актыўная жыццядзейнасць | 1110 | 11,1 | 12 |
| 2 | Жыццёвая мудрасць | 1090 | 10,9 | 11 |
| 3 | Здароўе | 250 | 2,5 | 1 |
| 4 | Цікавая работа | 510 | 5.1 | 4 |
| 5 | Прыгажосць прыроды і мастацтва | 1350 | 13,5 | 15 |
| 6 | Любоў | 330 | 3,3 | 2 |
| 7 | Матэрыяльна забяспечанае жыццё | 630 | 6,3 | 6 |
| 8 | Добрыя і надзейныя сябры | 620 | 6,2 | 5 |
| 9 | Грамадскае прызнанне | 880 | 8,8 | 8 |
| 10 | Інтэлектуальнае развіццё | 1090 | 10,9 | 11 |
| 11 | Максімальнае выкарыстанне сваіх магчымасцяў і сіл | 1120 | 11,2 | 13 |
| 12 | Пастаяннае фізічнае і духоўнае самаўдасканаленне | 1110 | 11,1 | 12 |
| 13 | Забавы | 1120 | 11,2 | 13 |
| 14 | Свабода | 1000 | 10 | 9 |
| 15 | Шчаслівае сямейнае жыццё | 460 | 4,6 | 3 |
| 16 | Шчасце другіх людзей | 1260 | 12,6 | 14 |
| 17 | Творчасць | 1060 | 10,6 | 10 |

| № п/п | Спіс тэрмінальных каштоўнасцяў | Агульны рангавы бал | Сярэдні рангавы бал | Рангавае месца |
|---|---|---|---|---|
| 18 | Упэўненасць | 700 | 7 | 7 |

Сярэдні рангавы бал вызначаўся па формуле: $M = \frac{\sum(V \times P)}{n}$, дзе М – сярэдняя велічыня, V – варыянта, P – частыня сустракаемасці варыянт, n – агульная колькасць варыянт. У нашым выпадку: n=100; $V \in (1;18)$.

З прыведзенай табліцы відаць, што важнейшымі жыццёвымі каштоўнасцямі сучасных старшакласнікаў з'яўляюцца здароўе, любоў, шчаслівае сямейнае жыццё. Названыя каштоўнасці ў рангавай табліцы занялі 1-е, 2-е, 3-е месцы адпаведна. Іменна гэтыя фундаментальныя агульначалавечыя каштоўнасці ў наш складаны зменлівы час з'яўляюцца важнейшай умовай паспяховага асобаснага і прафесійнага самавызначэння сучаснай вучнёўскай моладзі.

Цікавая работа, як адна з важнейшых чалавечых каштоўнасцяў заняла чацвёртае месца ў рангавай табліцы.Гэта сведчыць аб тым, што будучае хвалюе сучасных старшакласнікаў, а патрэба ў прафесійным самавызначэні з'яўляецца адной з важнейшых патрэбаў ў гэтым узросце. Прафесійнае самавызначэнне разглядаецца сучаснымі даследчыкамі як складанае інтэграванае паняцце, якое з'яўляецца "станавым хрыбтом" жыццёвага самавызначэння (4).

Матэрыяльна забяспечанае жыццё хоць і актуальна для сучасных старшакласнікаў (6-е рангавае месца), але ўсё ж яно уступіла 5-е месца такой чалавечай каштоўнасці як добрыя і надзейныя сябры, што адпавядае сацыяльнай сітуацыі развіцця падлетка і юнака (1;4).

Сярэдні ранг у такой важнейшай каштоўнасці як упэўненасць у сабе. Паколькі гэта важная ўмова прафесійнага самавызначэння, то педагагічная падтрымка аптанта павінна быць накіравана на фарміраванне веры ў яго індывідуальныя магчымасці, у магчымасць здзяйснення уласнага сэнсу жыцця(2,6).Трывожыць той факт, што моладзь застаецца амаль раўнадушнай да творчасці (10-е рангавае месца). Інтэлектуальнае развіццё, пастаяннае духоўнае і фізічнае самаўдасканаленне, максімальнае выкарыстанне сваіх магчымасцяў, сіл і здольнасцяў атрымалі яшчэ вышэйшы рангавы бал, адпаведна – яшчэ больш нізкія рангавыя месцы (11-е,12-е,13-е). Між тым патрэба ў самаактуалізацыі – гэта найважнейшая чалавечая патрэба (7). У канцэпцыі іерархіі патрэб Маслоу яна займае найвышэйшую ступеньку. Самаактуалізацыя – гэта нішто іншае, як працэс самаразвіцця патэнцыяльных магчымасцяў чалавека, імкненне да самарэалізацыі ў жыцці, асобаснаму росту, становчай каш-

тоўнаснай арыентацыі. Калі жыццё – гэта працэс выбару, то самаактуалізацыя абазначае выбар на карысць росту(7).

Так, шлях да самаактуалізацыі цяжкі. Не ўсе дасягаюць гэтага найвышэйшага узроўню развіцця. Прычына тут у тым, што юнакі і дзяўчаты не ведаюць пра свае індывідуальныя магчымасці, не разумеюць карысці самаўдасканалення. Педагог павінен дапамагчы вучню знайсці, асэнсаваць свае індывідуальныя каштоўнасці, што будзе садзейнічаць яго адэкватнаму прафесійнаму самавызначэнню. У працэсе пошуку каштоўнасцяў чалавек пастаянна робіць выбар паміж рухам наперад і адступленнем назад, паміж аддаленнем ад самаактуалізацыі і набліжэннем да яе.

ЛІТАРАТУРА


1. Божович Л.И. Личность и её формирование в детском возрасте. – М., 1968
2. Гершунский Б.С. Философия образования. – М., 1998
3. Гинзбург М.Р. Психология личностного самоопределения -М. 1996
4. Климов Е.А. Психология профессионального самоопределения. – М.,1984
5. Кон И.С. В поисках себя. – М.,1984
6. Фокина Г.П. Концепция жизни и роль философской теории в её формировании. В кн. Социальные функции философии. -Свердловск, 1981
7. Maslow A.H. Motivation and personality (3rd. ed.). New-York: Harper and Row, 1987


## ФИЛОСОФСКИЕ ЦЕННОСТИ В КОНТЕКСТЕ ГУМАНИТАРНОГО ОБРАЗОВАНИЯ


Максимов А. Г.

г.Брест, БПИ


Конец века, а тем более приближение нового тысячелетия невольно наводит на размышления о будущем человеческой цивилизации, о будущем человека. То, каким будет этот человек, на какие ценности и ориентиры он будет опираться в наступающем веке во многом определяется уже сейчас, и не последнюю роль в этом играет современная образовательная система, которая в значительной степени формирует мировоззренческие убеждения и взгляды личности, его индивидуальную систему ценностей.

Становление системы ценностных ориентаций в той или иной степени происходит на протяжении всего жизненного пути. При этом с уверенностью можно сказать, что основные, базовые понятия закладываются еще в раннем юношеском возрасте, в период обучения в школе.

В этот период молодой человек становится перед необходимостью осознания смысловых основ своей жизни, сталкивается с рядом обстоятельств, ко-